Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Зімовіцкая базавая школа Мазырскага раёна”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
# “АКТЫВІЗАЦЫЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ РАБОТУ З ТЭКСТАМ”

Басак Таццяна Міхайлаўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
тэл.: 8029 5331989
e-mail: t.basak2000@mail.ru

Інфармацыйны блок

Назва тэмы вопыту

Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы праз работу з тэкстам

Актуальнасць вопыту

У сучаснай адукацыі назіраецца супярэчнасць паміж павелічэннем аб'ёму інфармацыі, якую павінен засвоіць вучань, і абмежаванасцю часам на яе апрацоўку. Традыцыйныя метады навучання беларускай мове часта арыентаваны на засваенне правілаў і выкананне фармальных практыкаванняў, што не заўсёды спрыяе развіццю ўстойлівай пазнавальнай дзейнасці, фарміраванню моўных кампетэнцый. Практыка паказвае, што многія вучні адчуваюць цяжкасці ў асэнсаваным чытанні; не ўмеюць вылучаць галоўнае, абагульняць, рабіць высновы; праяўляюць нізкую пазнавальную актыўнасць, чакаюць гатовых адказаў; не бачаць сувязі паміж вывучэннем мовы і рэальным жыццём. Сёння настаўнік можа дасягнуць поспехаў у рэалізацыі навучальных задач пры ўмове актыўнага фарміравання ўстойлівай пазнавальнай дзейнасці і цікавасці вучняў да прадмета, развіцця іх інтэлектуальных і творчых здольнасцей.

Актуальнасць майго вопыту вызначаецца неабходнасцю пераадолення гэтых супярэчнасцей праз арганізацыю работы з тэкстам як асноўным сродкам актывізацыі пазнавальнай дзейнасці. Тэкст разглядаецца не проста як дыдактычны матэрыял, а як крыніца для даследавання, разважання, творчасці і развіцця асобы вучня. Для гэтага ад сучаснага настаўніка беларускай мовы і літаратуры патрабуецца не толькі пошук новых прыёмаў, заданняў і форм навучання, але і ўменне арганізаваць вучэбную дзейнасць так, каб яна стала цікавай на ўсіх этапах урока.

Вучням 5 класа для выяўлення ўзроўню актывізацыі пазнавальнай дзейнасці прапанавала самастойна распрацаваныя заданні да тэксту. Гэтыя заданні выявілі ўзровень самастойнасці вучняў, іх здольнасць да аналізу, параўнання, абагульнення і творчага выкарыстання моўных сродкаў. Кожнае

заданне мела моўную і пазнавальную скіраванасць, што дазваляла не толькі замацоўваць арфаграфічныя, пунктуацыйныя і граматычныя нормы, але і стымуляваць цікавасць да роднай мовы (дадатак 2). Вынікі паказалі: уменне вылучаць галоўную думку, складаць план тэксту – 40%; тып і стыль тэксту – 20%; уменне падбіраць сінонімы, антонімы, амонімы да слоў, тлумачыць значэнне слоў і фразеалагізмаў – 40%; вызначаць марфалагічныя прыметы часцін мовы – 20 %; уменне прымяняць правілы правапісу – 20%.

Мэта вопыту

Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы праз выкарыстанне эфектыўных прыёмаў і заданняў у рабоце з тэкстам.

Задачы вопыту

1. Падабраць і апрабіраваць тэксты для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні розных тэм і раздзелаў.

2. Выкарыстаць найбольш эфектыўныя прыёмы і заданні пры рабоце з тэкстам.

3. Прааналізаваць эфектыўнасць прымянення прыёмаў і заданняў пры рабоце з тэкстам для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Працягласць працы над вопытам

Над тэмай вопыту працую з 2021 года па сённяшні час.

Этапы фарміравання вопыту:

I. Выяўленне і тэарэтычнае абгрунтаванне эфектыўных прыёмаў і заданняў работы з тэкстам для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Аналіз метадычнай літаратуры, эфектыўнага педагагічнага вопыту па тэме.

II. Распрацоўка заданняў для вучняў V-VII на аснове мастацкіх, публіцыстычных і навукова-папулярных тэкстаў для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

III. Вызначэнне эфектыўнасці прымянення тэкстаў для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Апісанне тэхналогіі вопыту

Вядучая ідэя вопыту

Вядучая ідэя вопыту заключаецца ў тым, што сістэмная, паэтапная і правільна пабудаваная работа з тэкстам ператварае вучня з пасіўнага атрымальніка ведаў у актыўнага суб'екта пазнавальнай дзейнасці, забяспечвае фарміраванне моўнай, маўленчай і камунікатыўнай кампетэнцый праз унутраную матывацыю.

Апісанне сутнасці вопыту

Тэкст з'яўляецца адзінкай зносін і асноўным сродкам навучання. Лявонцьеў А. М. адзначае, што разуменне тэксту – гэта актыўны мысленчы працэс, які ўключае прагназаванне, інтэрпрэтацыю. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці адбываецца пры ўключэнні механізмаў сэнсавай перапрацоўкі інфармацыі. Паводле Якуба Коласа, тэкст, які даецца для вывучэння, "павінен закранаць у дзяцей лепшыя струны іх, развіваць гатоўнасць стаяць за грамадзянскія ідэалы" [1]. Праз тэксты вучні далучаюцца да ведаў, да разнастайных звестак, назапашаных людзьмі за гады і стагоддзі [2]. Асаблівую ролю адыгрываюць тэксты з патрыятычным зместам, якія пашыраюць краязнаўчыя веды і стымулююць аналіз жыццёвых сітуацый [3]. Адным з асноўных патрабаванняў да вынікаў па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" ў адукацыйным стандарце сярэдняй адукацыі адзначана: навучэнец павінен авалодаць ведамі аб сістэме беларускай фанетыкі, арфаэпіі, арфаграфіі, лексікі, фразеалогіі, складзе слова і словаўтварэнні, марфалогіі, сінтаксісе і пунктуацыі; моўнымі і маўленчымі паняццямі [4]". Гэтыя веды не існуюць асобна, яны актыўна інтэгруюцца пры рабоце з тэкстам.

У рабоце з тэкстам вялікі ўклад унеслі беларускія мовазнаўцы Варанец В.І, Ляшчынская В.А., Васюковіч Л.С, дзе падкрэсліваецца важнасць тэксту як сродку фарміравання лінгвістычнай і камунікатыўнай кампетэнцый вучняў.

У адукацыйнай праграме па прадмеце "Беларуская мова", адзначана, што для "актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў выкарыстоўваюцца метады праблемнага навучання, інтэрактыўныя, эўрыстычныя, гульнявыя метады, дыскусіі, метад праектаў і іншыя". У маёй метадычнай картатэцы ёсць прыёмы і заданні, прыклады тэкстаў, якія можна выкарыстоўваць на розных этапах

урока. Я пачала часцей звяртацца да мастацкіх, публіцыстычных, навуковых тэкстаў са зборніка В.А. Ляшчынскай [5], а таксама тэкстаў з іншых крыніц, адаптаваных у адпаведнасці з узростам і тэмай урока, каб навучыць навучэнцаў знаходзіць і адбіраць патрэбную інфармацыю, аналізаваць і ацэньваць яе, рабіць абгрунтаваныя вывады.

Мною былі падабраны эфектыўныя прыёмы ў рабоце з тэкстамі.

| Этапы ўрока | Прыёмы | Запланаваныя вынікі |
|---|---|---|
| Матывацыйна-арганізацыйны этап | "Завяршы фразу" | Уключае вучняў у сумесную дзейнасць, развівае пазнавальную цікавасць |
| | "А ці ведаеце вы, што?.." | Уключае вучняў у сумесную пазнавальную дзейнасць |
| | "Што я бачу?" | Факусіруе ўвагу на асноўных аспектах тэмы, стварае праблемную сітуацыю |
| Пазнавальна-аперацыйны этап | "Ключавыя словы"<br>"Воблака слоў" | Дазваляе праверыць глыбіню, асэнсаванне набытых ведаў, выявіць і скарэкціраваць прабелы |
| | "Рэшата" | Дапамагае вызначыць узровень засваення вывучанай тэмы |
| | "Крыжыкі-нулікі" | Фарміруе ў навучэнцаў цэласнасць сістэмы вядучых ведаў |
| | "Думай, абмяркуй, адкажы" | Уключае вучняў у сумесную дзейнасць |
| Дыягнастычна-карэкцыйны | "Інтэрв'ю" | Дапамагае вучням узнавіць вывучаны матэрыял, накіроўвае іх думаць у акрэсленым кірунку |
| | "Хвілінка творчасці" | Развівае ўменне ствараць уласныя тэксты |
| Кантрольна-ацэначны этап | "Тры М" | Дазваляе вучням усвядоміць, ацаніць эфектыўнасць сваёй дзейнасці |
| | "Аўкцыён" | Дапамагае вызначыць узровень засваення вывучанай тэмы, матывуе вучняў да станоўчага выніку |

Здзіўленне – пачатковая фаза развіцця пазнавальнай дзейнасці. Дзякуючы эфекту нечаканасці ў вучняў развіваюцца станоўчыя эмоцыі да ўспрымання вучэбнага матэрыялу. На ўроку ў 5 класе па тэме "Лексічнае значэнне слова" на матывацыйна-арганізацыйным этапе выкарыстоўваю яркае запамінальнае заданне "А ці ведаеце вы, што?..". Напрыклад, перад работай з тэкстам вучням задаю пытанне: "А ці ведаеце вы, што такое "мезаліт", хто такі

“краманьёнец”?”. Навучэнцы выказваюць свае меркаванні, потым прашу вучняў назваць вёскі, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай вобласці, дзе былі выяўлены рэшткі прыладаў працы старажытнага чалавека. Пасля знаёмства з тэкстам, працуем над лексічным значэннем гэтых слоў, знаходзім вёскі на карце Гомельскай вобласці. Далей прапаную заданні да тэксту па тэме. Дадзены прыём на ўроку забяспечвае псіхалагічную гатоўнасць класа да працы, павышае пазнавальную дзейнасць, актывізуе мысленне і фарміруе ўменне працаваць з лексічным значэннем слоў у кантэксце, што рыхтуе іх да асноўнай тэмы ўрока. Пошук вёсак на карце, супастаўленне тэкставай інфармацыі з геаграфічнымі аб’ектамі вучыць здабываць веды з розных крыніц.

У 7 класе на ўроку па тэме “Неазначальная форма дзеяслова, яе сінтаксічная роля” выкарыстоўваю прыём “Завяршы фразу”. На дошцы запісана выказванне, якое трэба вучням прачытаць, запісаць у сшытак сваё меркаванне: “Вітацца – …”. Слухаю адказы вучняў. Пасля агучваю і запісваю на дошцы правільны адказ: “Вітацца – добрая справа”, задаю пытанні: “Ці згодны вы з гэтым меркаваннем? Ці ведаеце вы, чаму людзі пры сустрэчы кажуць адзін аднаму: “Добры дзень!”? Пасля аргументацыі вучнёўскіх выказванняў прапаную тэкст паводле Х. Жычкі, заданні да яго (дадатак 2). Гэты прыём садзейнічае эфектыўнаму засваенню новай інфармацыі, развівае здольнасць не прымаць на веру любую інфармацыю, фарміруе камунікатыўныя ўменні, стымулюе далейшае вывучэнне тэмы, абуджае цікавасць ужо ў самым пачатку ўрока.

На пазнавальна-аперацыйным этапе для праверкі глыбіні набытых ведаў і правіл, выяўлення і карэкцыі прабелаў выкарыстоўваю прыём “Ключавыя словы”. Напрыклад, на ўроку ў 5 класе па тэме “Апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы. Клічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа (паўтарэнне)” прапаную картку “Воблака слоў” (дадатак 2), на якой змешчаны ключавыя тэрміны: сказ, пытальнік, клічнік, кропка, пабуджэнне, інтанацыя, клічныя, няклічныя, выказванне, тэкст. Вучні адразу тлумачаць правіла, а далей

працуюць з тэкстам (дадатак 2). Дадзены прыём садзейнічае актуалізацыі атрыманых ведаў, развіццю пазнавальнай дзейнасці.

Каб арганізаваць працу ў парах (групах), выкарыстоўваю прыём “Думай, абмяркуй, адкажы”. На ўроку ў 5 класе пры вывучэнні тэмы “Коска паміж часткамі ў складаным сказе” вучням прапаную выканаць наступнае заданне: прачытайце тэкст, устаўце прапушчаныя злучнікі *і, але, каб, што, бо*. Пастаўце знакі прыпынку. Навучэнцы вядуць канструктыўны дыялог, потым абмяркоўваюць з іншымі парамі, улічваюць чужыя думкі, рэдагуюць заданне, афармляюць у пісьмовым фармаце. Прыём накіраваны на разуменне і прымяненне новых ведаў; успрыманне знойдзенага рашэння, значнасць іншага меркавання і досведу.

*“Пасля поўначы месяц схаваўся ... неба зацягнулі хмары. Туравец, камісар партызанскай брыгады, быў задаволены ... наступіла цемра. Яна паможа падысці да чыгункі непрыкметна. На досвітку прайшоў спорны дождж ... дарога стала слізкая. Каляіны і ямы напоўніліся вадой. Дождж не сціхаючы ліў і на світанні. Раніца была непрыкметная і хмурная. Брыгада спынілася на паляне ў лесе. Байцы прамоклі да ніткі ... кастроў разводзіць не дазволіў ... не дэманстраваць брыгаду (Паводле І Мележа)”.*

Даю дадатковыя заданні: 1. Прыдумай па адным сказе пра партызан або прыроду, выкарыстоўваючы злучнікі *і, але, каб, што, бо.* 2. Па пачатку сказа з тэксту пры дапамозе дадзеных злучнікаў складзі і дапішы працяг: *Месяц схаваўся ... (і)... . Брыгада спынілася на паляне ... (але) ... . Туравец не дазволіў разводзіць кастры ... (каб) ... .*

Гэтыя заданні накіраваны на разуменне ролі злучніка ў сказе, развіццё маўлення, творчае прымяненне ведаў.

Для абагульнення і сістэматызацыі ведаў выкарыстоўваю прыём “Інтэрв’ю”. Ён дапамагае праверыць вывучанае, развівае ўменне думаць у акрэсленым кірунку, камунікатыўныя навыкі, абуджае цікавасць да становішча і быць карэспандэнтам. Вучням прапануецца выбраць сабе субяседніка, далей называюцца (або рыхтуюцца) 2-3 пытанні для інтэрв’ю. На працягу трох хвілін

субяседнікі абменьваюцца інфармацыяй паміж сабой па прапанаваных пытаннях, што пабуджае вучняў да фарміравання ўмення слухаць. Далей парам патрэбна аператыўна прадставіць атрыманую інфармацыю (дадатак 1). Пры вывучэнні тэмы ў 6 класе “Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме “Лічэбнік” прапаную вучням тэкст “Белавежская пушча” са зборніка В.А. Ляшчынскай і агучваю пытанні: *1. Назавіце з тэксту колькасныя лічэбнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. 2. Знайдзіце ў тэксце парадкавыя лічэбнікі. 3. Вызначце разрад трох лічэбнікаў з тэксту. 4. У тэксце ёсць лічэбнік “7”. Чаму ён напісаны лічбай, а не словам? 5. Пералічыце лічэбнікі, якія абазначаюць час, словамі, правільна скланюючы іх пры неабходнасці. 6. Падлічыце, колькі ўсяго лічэбнікаў (колькасных і парадкавых) ужыта ў тэксце. Падзяліце іх на групы паводле значэння.* Дадзеныя заданні развіваюць навыкі сэнсавага чытання і аналізу тэксту, сінтаксічныя, лексічныя і фразеалагічныя ўменні, паглыбляюць веды па марфалогіі і арфаграфіі, вызначаюць граматычныя асаблівасці назваў ягад у беларускай мове ў параўнанні з рускай, стымулююць пазнавальную цікавасць да роднай мовы і краязнаўства.

Пры вывучэнні новага матэрыялу прыём “Рэшата” дапамагае вызначыць узровень засваення вывучанай тэмы і выявіць прабелы ў ведах вучняў, а таксама спрыяе развіццю ўмення класіфікаваць і вылучаць патрэбную інфармацыю. Пры вывучэнні тэмы ў 6 класе “Лік назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах” прапаную заданне “Прасейце”. Вучням трэба выпісаць з тэксту назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку і назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку, і растлумачыць лексічнае значэнне слоў. Пасля працы па тэме ўрока задаю вучням дадатковыя пытанні на замацаванне (дадатак 2). Пры дапамозе гэтага прыёма вучні змогуць размяркоўваць словы па групах, здабываць патрэбную інфармацыю з тэксту, праяўляюць цікавасць да даследавання моўных з'яў праз практычнае заданне.

Для сістэматызацыі і абагульнення ведаў прымяняю прыём “Крыжыкі-нулікі”. Сутнасць прыёму заключаецца ў тым, што рыхтую на лістах паперы 9 пытанняў у канвертах па тэме ўрока, раскладаю ў фармаце 3 на 3. Вучні дзеляцца на дзве каманды (“Крыжыкі”, “Нулікі”) і па чарзе адказваюць на пытанні. Гэты прыём дазваляе праверыць набытыя веды па тэме ўрока, працаваць у камандзе і выказваць сваё меркаванне. Напрыклад, на ўроку ў 6 класе па тэме “Падагульненне і сітэматызацыя вывучнага па тэме “Назоўнік” прапаную вучням тэкст “Крыж-святыня” і заданні да яго (дадатак 2). Вынік дадзенага прыёму заключаецца ў тым, што вучні не толькі паўтараюць і сістэматызуюць веды па тэме “Назоўнік”, але і вучацца працаваць у камандзе, хутка прымаць рашэнні, аргументаваць сваю думку і атрымліваць задавальненне ад вучобы праз гульню. Гэта спрыяе фарміраванню пазітыўнага стаўлення да прадмета.

На дыягнастычна-карэкцыйным этапе выкарыстоўваю прыём “Хвілінка творчасці”, які дазваляе падтрымліваць пазнавальную цікавасць, развівае творчае ўяўленне навучэнцаў, узбагачае іх слоўнікавы запас, выпрацоўвае ўменне аргументавана даваць адказы на прапанаваную тэму. Пры вывучэнні тэмы “Паняцце пра фразеалагізмы, роля фразеалагізмаў у маўленні” ў 5 класе прапаную карткі з малюнкамі, па якіх патрэбна адгадаць і растлумачыць фразеалагізмы [6], скласці тэкст з адным на выбар (5 – 7 сказаў).



*1) Лічыць варон. 2) Працаваць не пакладаючы рук. 3) Цягнуць ката за хвост. 4) Вадзіць за нос. 5) Кракадзілавы слёзы. 6) Як вавёрка ў коле. 7) Як курыца лапай. 8) Як свае пяць пальцаў. 8) Вакол пальца.*

На кантрольна-ацэначным этапе пры правядзенні рэфлексіі арганізоўваю абмеркаванне пройдзенага такім чынам, каб вучань змог ацаніць і прадэманстраваць, як змяніліся яго веды на працягу ўрока.

Прыём “Аўкцыён” спрыяе стварэнню ўмоў для свядомага і трывалага засваення ведаў па тэме праз элементы спаборніцтва, павышае матывацыю для атрымання высокай адзнакі за ўрок [7]. Вучні ў форме гульні паўтараюць і сістэматызуюць вывучанае, вучацца доказна, хутка і выразна выказваць свае меркаванні. Напрыклад, у 6 класе на ўроку “Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме “Прыметнік”” (дадатак 2), гэты прыём дапамагае вучням не толькі знайсці прыметнікі ў тэксце “Пры дарозе”, а таксама падабраць сінонімы і антонімы, знайсці іх разрады. *Лот № 1. “Знаўца тэксту”. Заданне: знайдзіце ў тэксце ўсе прыметнікі. Выйграе той, хто назаве апошні прыметнік, які не назвалі іншыя. Лот №2. “Тры рады”. Заданне: размяркуйце любыя 5 прыметнікаў па разрадах (якасныя, адносныя, прыналежныя). Хто зробіць гэта дакладна і без памылак? Лот №3. “Скланенне прыметніка”. Заданне: праскланяйце словазлучэнне “зялёная страха” (з тэксту) у адзіночным ліку. Хто зробіць хутчэй і правільна?*

Прыём “Тры М” дазваляе развіваць уменне суадносіць свае дзеянні з запланаванымі вынікамі, ажыццяўляць кантроль сваёй дзейнасці. Навучэнцы пералічваюць тры моманты, якія ў іх найлепш атрымаліся, вынікамі якіх яны задаволены, і прапануюць адно дзеянне, якое палепшыць іх пасяховасць на наступным уроку. Напрыклад, я адказаў на ўсе пытанні па тэме, дапамог сябру выканаць заданне, без памылак выканаў тэст, на наступным уроку не буду хваляваўца (дадатак 1). У 7 класе пры вывучэнні тэмы “Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле “Дзеяслоў” вучні працуюць з тэкстам “Каравай” са зборніка В. А. Ляшчынскай (дадатак 2). Дадзены прыём дапамагае вучням аналізаваць уласную дзейнасць на ўроку, усвядоміць, што яны ўжо ўмеюць (вызначаць дзеясловы, устаўляць арфаграмы), выявіць прабелы (трыванні дзеяслова, правапіс *не/ня* з дзеясловамі) і намеціць шлях для паляпшэння.

Заключэнне

Распрацоўка, падбор і выкарыстанне заданняў пры рабоце з тэкстамі даюць станоўчы вынік: вучні лепш успрымаюць вучэбны матэрыял, арыентуюцца ў тэме, фарміруюць навыкі самастойнай працы, даюць шырокія магчымасці для развіцця творчасці.

Для вызначэння выніковасці вопыту вучням 7 класа прапанавала заданні да тэксту. Праведзены аналіз паказвае станоўчую дынаміку: уменне вылучаць галоўную думку, складаць план тэксту – 60%; тып і стыль тэксту – 60%; уменне падбіраць сінонімы, антонімы, амонімы да слоў, тлумачыць значэнне слоў і фразеалагізмаў – 60%; вызначаць марфалагічныя прыметы часцін мовы – 40%; уменне прымяняць правілы правапісу – 40%. Навучэнцы на ўроках беларускай мовы пачалі актыўна ўдзельнічаць у абмеркаванні прапанаваных заданняў пры рабоце з тэкстам, праяўляць цікавасць да вывучаемага матэрыялу. Мае вучні прымаюць актыўны ўдзел у алімпіядах, з’яўляюцца пераможцамі і лаўрэатамі ў конкурсах па беларускай мове і літаратуры, такіх як “Буслік”, “Захаваем свет разам”, конкурс рытарычнага майстэрства “Жывая класіка”, ”Карабель надзеі”, адкрыты фестываль "Кніга – пачатак усіх навук", конкурс “Купалаўскія чытанні”.

Лічу, што ўрокі з выкарыстаннем апісаных прыёмаў і заданняў дапамагаюць актывізаваць пазнавальную дзейнасць вучняў, удасканальваюць уменні дзяцей акцэнтаваць увагу на галоўным у тэкстах, павялічваюць аб’ём тэаратычных ведаў, садзейнічаюць іх прымяненню на практыцы ў творчай дзейнасці. Такім чынам, можна адзначыць, што прапанаваныя прыёмы работы з тэкстамі і падабранымі заданнямі да іх, робяць працэс навучання цікавым, стымулююць усведамленне вучнямі ўласных дзеянняў, дазваляюць вырашаць многія задачы курса беларускай мовы эфектыўна. Калі выкарыстоўваць апісаныя прыёмы на кожным уроку, то ў кожнага вучня, незалежна ад здольнасцей, з’яўляецца магчымасць дасягнуць больш высокіх вынікаў.

Дадзены вопыт можа прымяняць настаўнік для таго, каб абудзіць цікавасць да вывучэння беларускай мовы. Лічу, што дадзены накірунак працы

перспектыўны. Спадзяюся, што зацікаўленасць вучняў прадметам з узростам не знікне, а, наадварот, павялічыцца.

Матэрыялы дадзенага вопыту былі прадстаўлены на пасяджэнні вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў грамадска-філалагічнага цыклу школы (студзень 2024, выступленне па тэме “Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы праз работу з тэкстам”), педагагічнага савета (сакавік 2025). Практычныя матэрыялы пасля праведзеннння адкрытых урокаў размешчаны ў метадычнай скарбонцы школы. Вопыт можа быць выкарыстаны ў практыцы іншых настаўнікаў, як маладых спецыялістаў, так і вопытных педагогаў, якія выкладаюць на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Планую ўдасканальваць працу па прапанаванай тэме. Лічу, што дадзеная тэма мае перспектывы развіцця і вялікае поле дзейнасці.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Рыкун, Н. Ф. Выхаванне грамадзянскай культуры вучняў на аснове працы з мастацкім тэкстам на ўроках беларускай мовы (на прыкладзе V і VI класаў) / Н. Ф. Рыкун // Беларус. мова і літ. – 2014. – № 11. – С. 3 – 11

2. Ляшчынская, В. А. Тэкст на ўроках роднай мовы / В. А. Ляшчынская. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. – 64 с.

3. Чахлова, Т. Ф. Змест і арганізацыя метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2025/2026 навучальным годзе / Т. Ф. Чахлова // Беларус. мова і літ. – 2025. – № 9. – С. 3 – 9

4. Национальный образовательный портал Республики Беларусь / Образовательные стандарты общего среднего образования. – URL: https://adu.by/images/2025/12/W22544307p_1765918800.pdf (дата обращения: 25.02.2026).

5. Ляшчынская, В. А. Арфаграфія і пунктуацыя сучаснай беларускай мовы : вучэб. дапаможнік / В. А Ляшчынская, М. У. Буракова, З. У. Шведава. – Мінск : РІВШ, 2014. – 278 с.

6. Севасцьяновіч, Н.У. Паняцце пра фразеалагізмы, роля фразеалагізмаў у маўленні / Н. Севасцьяновіч // Беларус.мова і літ. – 2021. – № 4. – С. 17-21
7. Юзвик, И.И. Конструктор урока. Пособие для учителей учреждений образования, реализующих образовательные программы общего, среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания / И.И. Юзвик, Г.В. Свентуховская // ГУО «Академия образования». – 2025

Дадатак 1

Урок беларускай мовы ў 5 класе

Тэма: Лексічнае значэнне слова

Мэта: фарміраванне навыкаў і ўменняў неабходных для засваення паняцця аб лексічным значэнні слова праз работу з тэкстам.

Задачы:

даць паняцце пра лексічнае значэнне слова, вызначаць лексічнае значэнне слоў па тлумачальным слоўніку, раскрываць значэнне слова рознымі спосабамі, ужываць словы ва ўласным маўленні ў адпаведнасці з іх лексічным значэннем;

выпрацоўваць уменне адрозніваць граматычнае і лексічнае значэнні слова, узбагачаць слоўнікавы запас вучняў, развіваць уменне тлумачыць лексічнае значэнне слова разнымі спосабамі;

выхоўваць цікавасць да зімовых традыцый праз знаёмства з тэкстамі.

Тып урока: урок паведамлення новых ведаў і фарміравання навыкаў і ўменняў

Абсталяванне: вучэбны дапаможнік для 6 класа па беларускай мове, карткі з тэкстамі і заданнямі.

Ход урока

I. Матывацыйна-арганізацыйны этап

а) Арганізацыйна-псіхалагічная падрыхтоўка вучняў да работы.

– Сёння мы з вамі зноў адчуем мілагічнасць і хараство беларускай мовы. Разам адправімся ў падарожжа на “Зімовым цягніку слоў”.

Першая станцыя “Загадкавая паляна”. Адгадайце загадкі ізапішыце адказ.

Дзве палачкі, дзве сястрычкі, па сняжку бягуць па звычцы.

Іх на ногі апранай, хутка з горкі ты з’язджай (Лыжы)

Улетку адпачывалі: снежную пару чакалі.

А дачакаліся зімы – пакаціліся з гары. (Санкі)

– Што дапамагло знайсці адгадкі?

б) Аб’яўленне тэмы ўрока. Сумеснае вызначэнне мэт

в) Матывацыя вучэбнай дзейнасці (прыём “А ці ведаеце вы, што?..”)

– А ці ведаеце, вы што санкі і полаз звязаны паміж сабою? А слова “лыжы” звязана са словамі “лызгаць” і “шмаргануць”.

– А ці ведаеце вы дакладна, што абазначаюць гэтыя словы?

II. Пазнавальна-аперацыйны этап

Станцыя “Слоўнікавая”

а) Актуалізацыя апорных ведаў.

1. Арфаграфічная хвілінка

Спішыце ўрывак з верша. Падкрэсліце і растлумачце вывучаныя арфаграмы .

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег…

б) Знаёмства з новым матэрыялам

– Растлумачце лексічнае значэнне слова “мяцель”, падбярыце сінонімы. Як вы разумееце выраз “і волен лёгкіх санак бег”?

– Кожнае слова мае сваё лексічнае значэнне – тое, што яно абазначае. Падумайце, што абазначаюць словы “санкі”, “лыжы”.

Знаёмства з правілам на с. 86-87.

в) Першаснае замацаванне ведаў і фарміраванне ўменняў

Станцыя “Пазнавальная”

1. Работа з тэкстам

– Прачытайце тэкст на картках і выканайце заданні да яго (прыём “Ключавыя словы”).

*З вытокаў слова.*

*Лыжы. Паходжанне слова звязваецца з дзеясловам лызгаць (слізгаць па лёдзе), лызнуць, лызгануць (вышмаргнуць, уцячы). У іх так і чуецца лызы-лыжы. Значыць, у самім слове лыжы заключаецца іх галоўная прымета – слізганне.*

*Санкі. У нашай мове ёсць слова полаз (неядавітая змяя) і полаз (хадавая частка саней).Сані сваімі палазамі як бы паўзуць па зямлі і пакідаюць след,*

*чым нагадваюць змяю. Але ў старажытныя часы тую ж змяю называлі інакш – сань. Ад яго і паходзіць слова сані. Санкі - невялікія сані.*

Заданні:

1) Уважліва прачытайце першую частку тэксту. Выпішыце 3–4 ключавыя словы (ці словазлучэнні), якія раскрываюць паходжанне гэтага слова. Складзіце сказы, выкарыстоўваючы ўсе выпісаныя ключавыя словы.

2) Прааналізуйце другую частку тэксту. Знайдзіце ў ёй два "ланцужкі" ключавых слоў. Запішыце гэтыя ланцужкі і растлумачце сувязь паміж словамі.

Праверка адказаў вучняў.

– Прапаную пазнаёміцца з тэкстамі, якія склаў штучны інтэлект і запісаць сказы з тэксту, у якіх тлумачыцца лексічнае значэнне слоў "лыжы", "санкі".

*Лыжы вядомы людзям з даўніх часоў. Спачатку іх рабілі з дрэва, абмотвалі скурай. Цяпер бываюць пластыкавыя. Лыжы бываюць бегавыя, горныя, паляўнічыя. Для дзяцей робяць кароткія лыжы з фіксатарамі. Лыжы – гэта спартыўны інвентар для перасоўвання па снезе, які складаецца з двух доўгіх палазоў.*

*Санкі – гэта сродак перасоўвання зімой. Іх выкарыстоўваюць для забаў (катанне з горкі) і для гаспадаркі (перавозка сена, дроў). Санкі могуць быць драўлянымі, металічнымі. Санкі – прылада на палазах для язды па снезе або лёдзе.*

Праверка адказаў дзяцей. (Давесці да ведама дзяцей, што інфармацыя, якая здабыта настаўнікам пры дапамозе штучнага інтэлекту, не заўсёды поўная).

– Ці ведаеце вы, дзе можна знайсці дакладнае тлумачэнне гэтых слоў?

Праца з тлумачальным слоўнікам.

Фізкультхвілінка

Работа з правілам на с. 88 (прыём "Думай, абмяркуй, адкажы").

– Карыстаючыся правілам, падбярыце і запішыце найлепшы спосаб тлумачэння лексічнага значэння слоў. Словы для работы: *1 група – завея, мароз, сцюжа; 2 група – снегавік, лядзяш, крыга.*

Праверка адказаў дзяцей.

*Надышла сцюдзёная пара. Суровы снежань-зімнік намёў у лесе вялізныя гурбы, пачапіў на дрэвы і хмызнякі снегавыя шапкі, пухкімі белымі дыванамі заслаў лясныя паляны, лугі і палі. З вечара ўдарыў мароз, ды такі, што ўсю ноч у лесе стаяў трэск. Так плачуць ад холаду дрэвы. Да раніцы мароз зрабіўся яшчэ мацнейшым. Падзьмуў снежань свежымі марознымі вятрамі. Схаваў хуткія рэкі пад тоўсты блакітны лед. Стынуць, зацягваюцца лёдам нават лясныя крыніцы.*

*Ціха і спакойна ў зімовым лесе. Змоўклі птушкі і схаваліся звяры. Здаецца, што жыццё ў ім спынілася да будучай вясны. Цяжкая пара надышла для жыхароў лесу.*

Заданні:

1. Растлумачце, што азначаюць наступныя словы з тэксту. У выпадку цяжкасцяў звяртайцеся да тлумачальнага слоўніка: *сцюдзёная, гурбы, крыніцы, хмызняк.*

2. Размяркуйце словы з тэксту на тры тэматычныя групы: 1) Зімовыя з’явы і надвор’е. 2) Лес і яго жыхары. 3) Дзеянні.

3. Растлумачце словы па кантэксце: павесіў, прымацаваў зверху – ..; тоўстыя грудкі, камякі – ..; высокія, магутныя – ..; ціха, нячутна, без гукаў – ..; нялёгкая, важкая – …

Праверка адказаў дзяцей.

III. Дыягнастычна-карэкцыйны этап

Станцыя “Сустрэча з карэспандэнтам” (прыём “Інтэрв’ю”).

– Уявіце, што вам трэба даць інтэрв’ю карэспандэнту школьный газеты “Мовазнавец” да Тыдня беларускай мовы і літаратуры. Як, вы думаеце, ці складана падрыхтаваць пытанні да інтэрв’ю? Чаму? А як сябе адчувае той, у каго бяруць інтэрв’ю?

- Прапаную вам папрацаваць у парах і адчуць сябе ў ролі карэспандэнта і субяседнікам. Прачытайце тэкст і выканайце заданні.

*Зіма – выдатная пара для актыўнага адпачынку. У многіх дзяцей ёсць лыжы і санкі. Аднак не кожны ведае, што лексічнае значэнне гэтых слоў можа*

*быць прамым і пераносным. Прамое значэнне слова “лыжы” – спартыўны інвентар. У пераносным сэнсе могуць сказаць: “у яго лыжы не едуць” – значыць, не атрымліваецца штосьці зрабіць. А слова “санкі” ў пераносным значэнні сустракаецца радзей. Затое ёсць выраз “сесці не ў свае санкі” – гэта значыць узяцца за справу, якую ты не ў сілах выканаць.*

Заданні (працуюць у парах):

1 пара. “Інтэрв’ю са знаўцам слоў”. Карэспандэнт задае тры пытанні пра словы “лыжы” і “санкі”. Роля субяседніка: адказаць, абапіраючыся на тэкст.

1) Растлумачце, калі слова “лыжы” мае прамое значэнне, а калі – пераноснае.

2) Што азначае выраз “у яго лыжы не едуць”? Прывядзіце жыццёвы прыклад.

3) Сваё пытанне ______________________________________________________.

2 пара. “Сустрэча на школьным перапынку”. Карэспандэнт бярэ інтэрв’ю ў вучняў 5 класа. Складзіце тры пытанні, якія дапамогуць праверыць, ці разумеюць дзеці пераноснае значэнне слоў: *лёд, холад, снег.*

3 пара. “Інтэрв’ю-памылка”. Карэспандэнт пераблытаў прамое і пераноснае значэнне слоў. Выпраў словы карэспандэнта: “Я чуў, што слова “санкі” ў прамым значэнні – гэта калі чалавек узяўся не за сваю справу”. “Выраз “у яго лыжы не едуць” азначае, што ў чалавека зламаўся спартыўны інвентар”.

IV. Кантрольна-ацэначны этап

Станцыя “Завяршальная”

1. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.

2. Дамашняе заданне: с. 86-89, §22, пр. 176. Каменціраванне дамашняга задання.

3. Рэфлексія.

Прыём “Тры “М”

М… якія вас зацікавілі…

М… былі самыя цяжкія…

М… былі самыя карысныя…

Дадатак 2

I. Аналіз тэксту для вызначэння ўзроўню сфарміраванасці моўных уменняў

5 клас 7 клас Крытэрыі

Вынік: комплексны аналіз тэксту дазваляе аб’ектыўна ацаніць узровень валодання мовай на аснове пісьмовага маўлення.

II. Эфектыўныя прыёмы навучання для развіцця пазнавальнай дзейнасці вучняў

Прыём “А ці ведаеце вы што?..”

Тэкст “Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі”

Заданні:

1. Прачытай словы з тэксту. З дапамогай слоўніка вызначце іх лексічнае значэнне і запішыце. Словы: *неандэртальцы, паўзямлянка, бівень.*

2. Размеркуйце словы ў дзве калонкі: 1) Людзі і іх назвы; 2) Паселішчы і вёскі. Калі слова адносіцца да некалькіх груп – растлумач.

3. Замяні апісальны выраз адным словам з тэксту (напішы яго):

1) Старажытны чалавек, які жыў у Еўропе ў эпоху позняга палеаліту, наш непасрэдны продак.

2) Эпоха сярэдняга каменнага веку, калі канчаткова засялілі тэрыторыю Беларусі.

3) Жытло, заглыбленае ў зямлю, часам з дахам.

4) Рэшткі старажытнага паселішча чалавека.

5) Вырабы з крэменю, якімі карысталіся першабытныя людзі.

Гэтыя заданні развіваюць уменне працаваць з лексічным значэннем слова, выкарыстоўваць кантэкст, слоўнік і сінанімічныя магчымасці мовы.

Прыём “Завяршы фразу

Тэкст “Вітацца – добры звычай”

Заданні:

1. Прачытай тэкст. Выпішы ўсе дзеясловы ў неазначальнай форме.

2. Выпішы два сказы, у якіх неазначальная форма дзеяслова выступае ў ролі выказніка.

3. Выпішы тры дзеясловы прошлага часу і пастаў іх у неазначальную форму.

4. Дапоўні сказ, выкарыстоўваючы дзеяслоў у неазначальнай форме. “Калі я сустракаю сябра, я люблю ...”.

Гэтыя заданні дапамагаюць вучням вызначаць інфінітыў у тэксце; яго сінтаксічную ролю; утвараць ад інфінітыва формы прошлага часу і наадварот; выкарыстоўваць інфінітыў у маўленні.

Прыём “Воблака слоў”




Прыём “Ключавыя словы”

Мэта: праверыць узровень засваення ведаў па вывучанаму матэрыялу.

Тэкст “Перад кантрольнай”

Заданні:

1. Прачытайце тэкст. Выпішыце: апавядальны, пытальны, пабуджальны сказы.

2. Змяніце тып сказа па мэце выказвання так, каб сэнс захаваўся.

Запішыце новыя сказы. Апавядальныператварыце ў пытальны: *Кастусь вельмі хваляваўся.* Апавядальны ператварыце ў пабуджальны: *Кастусь уважліва слухаў…*

3. Працягніце дыялог паміж Кастусём і Алесяй пасля кантрольнай. Выкарыстайце ўсе тыпы сказаў па мэце выказвання. Напішы 3-4 рэплікі.

4. У тэксце ёсць сказ з клічнікам, але па мэце выказвання ён не пабуджальны. Знайдзіце яго. Чаму тут пастаўлены клічнік?

Гэтыя заданні дапамагаюць вучням адрозніваць сказы па мэце выказвання;

пераўтвараць адзін тып сказа ў другі; растаўляць правільна знакі прыпынку (кропку, пытальнік, клічнік); выкарыстоўваць розныя сказы ў маўленні.

## Прыём “Рэшата”

### Тэкст “Лета”

1. Падбярыце да тэксту загаловак і запішыце.
2. Знайдзіце фразеалагізм са словам “вока”, выпішыце і растлумачце яго лексічнае значэнне.
3. Выпішыце з тэксту назвы ягад і назавіце іх граматычную асаблівасць у параўнанні з рускай мовай.
4. Выпішыце з апошняга сказа назву кветкі ў пачатковай форме, падбярыце і запішыце да гэтага слова сінонім.
5. Выпішыце з тэксту рэчыўныя назоўнікі ў пачатковай форме.
6. Выдзеленае слова запішыце ў форме адзіночнага ліку творнага склону. Вызначце і запішыце скланенне назоўніка. Запішыце яшчэ 2 назоўнікі такога ж скланення ў творным склоне, у якіх адбываецца падаўжэнне.
7. Выпішыце з тэксту назоўнікі, ужытыя ў месным склоне (з прыназоўнікам).
8. Выпішыце сказ, у якім у ёсць аднародныя дзейнікі, падкрэсліце іх.

Галоўны вынік гэтых заданняў: фарміраване ў вучняў здольнасці прымяняць атрыманыя веды на практыцы.

## Прыём “Крыжыкі-нулікі”

Мэта: праверыць якасць засваення ведаў, вызначыць недахопы.

*У кожнага народа ёсць святыні, якімі мацней за жы(ц/цц)ё даражылі мудрыя прашчуры і якія, нібы нязгасныя паходні, асв(е/я)тляюць шляхі іх*

*на(сч/шч)адкам. Для беларускага народа такой святыняй з(‘/ь)яўляецца Кры(ж/ш) (Е/е)ўфрасінні (п/П)олацкай.*

*(Е/е)ўфрасіня (п/П)олацкая святая ап(я/е)кунка і першаасветніца нашага народа. Усё сваё жы(ц/цц)ё яна прысв(я/е)ціла служэ(н/нн)ю Богу і лю(д/дз)ям: пер(е/а)пісвала старадаўнія рукапіс(ы/і) і каза(н/нн)і , вучыла грамаце (дз/д)яцей л(е/я)чыла хворых. А яшчэ яна зб(я/і)рала грошы каб у родным гора(дз/д)е будаваліся Божыя храмы.*

*Па заказе (е/Е)ўфрасінні полацкі майстар (л/Л)азар (б/Б)огша зрабіў надзвычай прыгожы шасціканцовы кры(ш/ж).Каб паклані(ц/цц)а яму, у горад над (з/З)аходняй (д/Д)звіной прыходзілі вернікі (91 слова). (Паводле У.Ягоўдзіка)*

Заданні:

1. Вызначце, да якога стылю адносіцца тэкст.
2. Дайце загаловак тэксту.
3. Знайдзіце і выпішыце з тэксту назоўнікі з падоўжанымі зычнымі.
4. Падкрэсліце назоўнікі, у якіх літар больш, чым гукаў.
5. Выпішыце з тэксту назоўнікі-антонімы ў пачатковай форме.
6. Знайдзіце і выпішыце з тэксту ўстарэлы назоўнік з лексічным значэннем “пераносная свяцільня ў выглядзе ліхтара на доўгай палцы або наматанага на канец палкі прасмоленага пакулля; факел”, паставіўшы гэты назоўнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.
7. Падкрэсліце ў тэксце ўсе ўласныя назоўнікі.
8. Знайдзіце ў тэксце назоўнік, род якога не супадае ў рускай і беларускай мовах. Выпішыце яго, падабраўшы прыметнік, у пачатковай форме. Запішыце яшчэ 3 падобных словазлучэнні.
9. Выпішыце сказ, у якім дзейнік і выказнік выражаны назоўнікамі.

У працэсе гульнявога спаборніцтва вучні сістэматызуюць і паглыбляюць веды па тэме “Назоўнік”, адначасова развіваючы навыкі лінгвістычнага аналізу тэксту (стыль, лексіка, марфалогія, арфаграфія).

## Прыём “Тры М”

### Тэкст “Каравай”

Заданні:

1. Устаўце прапушчаныя літары ў дзеясловах і растлумачце правапіс (націскныя галосныя, чаргаванне зычных, ужыванне *“не”/“ні”*).
2. Вызначце асобу, лік дзеясловаў у сказе, знайдзіце зваротныя дзеясловы.
3. Складзіце невялікі тэкст (6-8 сказаў) на тэму “Сямейныя традыцыі”, выкарыстоўваючы дзеясловы толькі ў цяперашнім часе і зваротныя.

Тры моманты, якімі я задаволены: 1. Я правільна выпісаў усе дзеясловы прошлага часу з тэксту. 2. Я без памылак уставіў прапушчаныя літары ў дзеясловах. Я змог растлумачыць, чаму дзеяслоў частаваліся з’яўляецца зваротным. 3. Я паўтарыў правіла напісання часціц не і ня з дзеясловамі, каб не блытаць іх у сказе. Іншы варыянт адказу: 1. Мяне зацікавіла: чаму каравай мясілі толькі далонямі, а не кулакамі. Самым цяжкім было вызначыць трыванне дзеясловаў. Самым карысным было навучыцца адрозніваць зваротныя дзеясловы ад незваротных.

## Прыём “Што я бачу?”

Мэта: зацікавіць вучняў да вывучэння новай тэмы “Лічэбнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля”.

Вучням неабходна разгледзець малюнкі і падумаць, як яны звязаны паміж сабой, прывесці свае аргументы. Пасля агульнага абмеркавання аб’яўляецца тэма ўрока.

